УДК 398.3(=161.3)(476.5)

Д. В. Жукаў

Навук. кір. – У. Я. Аўсейчык, канд. гіст. навук, дацэнт

# ВОБРАЗ «ПАДАРОЖНАГА» БОГА ВА ЎЯЎЛЕННЯХ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ

У артыкуле разглядаецца вобраз «падарожнага» Бога ў кантэксце этыялагічных легенд. Асаблівая ўвага адведзена яго ролі ва ўсталяванні сацыяльных і этычных нормаў, а таксама з'яўленні сакральных элементаў ландшафту. Тэма даследавання актуальная, бо вобраз падарожнага Бога з�much яўляецца не толькі важнай часткай беларускага фальклору, але і неад‟емным кампанентам карціны светы і адлюстроўвае народныя ўяўленні пра справядлівасць, праведнасць, грахоўнасць – катэгорыі, аднолькава актуальныя ва ўсе гістарычныя эпохі.

Немалаважнае месца ў фальклорным ландшафце беларусаў займаюць уяўленні пра падарожнага Бога. Вобраз падарожнага Бога з‟яўляецца адным з найбольш спецыфічных і адметных у народнай прозе беларусаў. Этнаграфічныя экспедыцыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, праведзеныя на тэрыторыі Віцебшчыны ў 1995-2020 гадах, зафіксавалі значны аб‟ѐм матэрыялу, які адлюстроўвае сімволіку вобраза Бога ў карціне свету сельскага насельніцтва Падзвіння. У беларускай фальклорнай традыцыі пашыраны сюжэты, згодна з якімі першапачаткова Бог стварыў людзей волатамі ці асілкамі, але потым пакараў іх за тое, што яны вырашалі памерацца з ім сілай: «Гэта цяпер людзі здрабнелі да сталі нядужыя, а даўней былі такія велізарныя, бы дуб, да дужыя, што хацелі з Богам дужацца. Дык за тое Бог іх пакараў да й абярнуў у малых да кволых людзей, якія й цяпер жывуць» [2, с. 94]. У традыцыйных уяўленнях беларусаў Бог звычайна прадстаўлены ў выглядзе сівога барадатага старога, які жыве на небе і часам вандруе па зямлі. Як лічыцца, раней людзі жылі разам з Богам і мелі большы дастатак, чым цяпер. Сустракаюцца сюжэты, у якіх тлумачацца прычыны пакарання чалавечага роду. Так, адной з прычын, якая выклікала пакаранне, стала непаважлівае стаўленне людзей да хлеба: «Бог пасеяў шмат каласоў. А адна гаспадыня з гэтага жыта спякла блін і абцерла ім сваѐ дзіця. За гэта Бог апусьціў людзей на зямлю і даў ім толькі адзін каласок, бо хлеб – гэта сьвятое» (Бешанковіцкі раѐн Віцебскай вобласці) Фольклористика и этнография 262 [5, с. 47]. Ідэя паважлівага стаўлення да хлеба праводзіцца і ў легендах пра «сабачую і каціную долю», дзякуючы якой людзі маюць свой хлеб: «Ішоў Бог, зайшоўся к бабцы, а баба пякла бліны, а малы абробіўся. А яна ўсѐ раўно пякла бліны, і яму жопу падцѐрла. А ѐн сказаў: «Вот цяперака хлеба ў вас ня будзець». І тады гэты хлеб ѐн ужэ ўбіраў з коласа, а сабакі і каты як сталі драць, і затое малыя каласкі асталіся» (Ушацкі раѐн Віцебскай вобласці) [5, с. 61]. Але ў некаторых сюжэтах такога роду гаворыцца, што гэта пакаранне людзям за тое, што яны сталі рабіць з жыта гарэлку, або жанчыны самі папрасілі Бога скараціць каласкі, бо было цяжка жаць [5, с. 60]. Згодна з традыцыйнымі ўяўленнямі, менавіта Бог загадаў, каб людзі дапамагалі жабракам і тым, якія жывуць у нястачы: «Я нічога ад вас не хачу, адно дайце слова, што кажон тыдзень прымеце жабрушчага чалавека, якога пакорміце і пазволіце пераначаваць» [3, с. 43]. Лічыцца, што калі людзі верылі ў Бога, то нельга было чалавека абдзяліць. Ён нішчы, ѐн няшчасны – яму трэба дапамагчы: «Прыходзілі жабракі, да. Ім нада тожа даваць […]. Гэта відзіш, нада жабраку тожэ даць тое што ты сам ясі, што табе. Эта Бог жабракоў прысылаець» (Віцебскі раѐн Віцебскай вобласці) [6, с. 271]. Згодна легендамі, на такіх умовах Бог навучыў людзей прасякаць вокны ў доме. Адзін з самых распаўсюджаных сюжэтаў на Падзвінні пра мужыка і саламяны плот, які распавядае, чаму людзі перасталі ведаць, калі памруць: «Шоў Бог. А мужык гародзіць саломай плот. І Бог спрашвае: «Што вы так вот, саломай гародзіце?» А ѐн гаворыць: «Я заўтра памру, так для чаго мне гарадзіць яго?» Вот Бог і здзелаў, штоб вот іменна, каб не зналі людзі, памруць када. А то зналі людзі, кагда чалавек памрэць» (Полацкі раѐн Віцебскай вобласці) [5, с. 51]. Такое рашэнне было прынята Богам з-за таго, каб людзі не пераставалі працаваць і пакідалі што-небудзь нашчадкам. У архіве Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта захоўваюцца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

варыянты легенд «пра саламяны плот» з Полацкага, Глыбоцкага, Гарадоцкага, Ушацкага, Шумілінскага, Пастаўскага і Докшыцкага раёнаў Віцебскай вобласці. Другі папулярны сюжэт распавядае пра тое, як Бог дае людзям долю, з�甬яўляючыся да іх у выглядзе старога жабрака і даючы каштоўныя тлумачэнні бабцы-павітусе, якая прыняла яго на начлег: «А за гэтай бабкай прышлі, там баба адна ражала. А яна: «Не, не пайду». А ён кажыць: «Нельзя атказываць, ідзі. І як пайдзеш, паглядзі ў акно, што ім будзець даваць там Бог». А тая баба радзіла аж трайню. […] адзін рабёначак калышыцца, другі – плаваець па вадзе, а трэці сядзіць – вугалькі 263 перасыпаець. Прышла яна тады, старычку расказала. Дык ён кажыць: «Вот, бабулька, што, той, які калышыцца, – павешаецца, той, што плаваець па вадзе, – утопіцца, а гэтат, каторы вугалькі перабіраець, – той будзець дзеньгамі рукавадзіць» (Ушацкі раён Віцебскай вобласці) [5, с. 54]. Таксама сустракаюцца іншыя сюжэты, напрыклад, як Бог наканаваў лёс салдату або адзінаму сыну людзей, якія прынялі Бога ў хату [5, с. 57]. Шэраг легенд пра падарожнага Бога прысвечаны фальклорнаму (у пэўнай ступені гумарыстычнаму) тлумачэнню біясацыяльных адрозненняў паміж людзьмі, у прыватнасці – чым адрозніваецца праца мужчын і жанчын: «Божачка ішоў і сказаў бабе «здраствуй». Паклікаў яе аддыхнуць. А яна махнула рукой і сказала: «Мне некалі». Бог і сказаў: «Ну, хай табе будзе ўсё ўрэмя некалі». А да мужыка прышоў, той прысеў, пакурыў, пасядзеў. Ну, гэта і праўда: мужыку ёсць врэмя, а бабе ўсё некалі» (Чашніцкі раён Віцебскай вобласці) [5, с. 62]. Гэта апавяданне таксама з‛яўляецца адным з распаўсюджаных на Падзвінні. Беларускі народны эпас мае даволі значную групу легенд этыялагічнага характару. Яны своеасабліва расказваюць пра паходжанне розных аб‛ектаў і з‛яў. Сярод іх вылучаецца група легенд, якія апавядаюць пра з‛яўленне розных жывёл і раслін. Як вынікае з іх аналізу, у асноўным гэтая катэгорыя легенд пераплятае міфалогію і казачныя элементы з хрысціянскім веравучэннем. У шэрагу выпадкаў у легендах праяўляецца ўласцівы даўнім народным вераванням дуалізм. У той час, як стваральнікам усяго прыроднага на зямлі прызнаваўся Бог, тварцом усяго шкоднага і варожага чалавеку з'явіўся чорт. Згодна з легендамі, стварэнне ўсяго жывога і нежывога на зямлі прыпісваюцца Богу, хоць вобраз яго набываў усё больш «зямны» характар. Так, напрыклад, з меху, які Бог загадаў аднаму чалавеку кінуць у балота (мора) і не заглядаць у яго, па зямлі распаўзліся гады і разляцеліся мухі. Парушыўшы богаву забарону, чалавек пацікавіўся, што ў тым мяху, і развязаў яго. За гэта Бог пакараў чалавека, ператварыўшы яго ў бусла, і загадаў яму вечна збіраць гадаў, якія распаўзліся па зямлі: «Бог сабраў такіх насякомых, і мух, і клапоў, там усякіх казюрак і ў мяшок завязаў. Нясі, – гаворыць, – на тоя места, дзе яму сказалі. А ён што – нёс, нёс. А тады захацеў, каб паглядзець, каго ж ён нясець. Мяшок атвязаў, а му́шына – пырх. Вот ён кінуў мяшок, ні завязаў, за мушынай пабег. Каб улавіць. А к гэтаму ўрэмю ўсе распаўзліся. Вот ні было б у нас ні вужак, ні жаб, нічога. А так сталі і клапы, і ўсякія мухі, і казюркі. Бог яго заставіў... Буцяном здзелаў і сказаў: сабірай» (Ушацкі раён Віцебскай вобласці) [5, с. 28]. На Падзвінні некаторыя дэталі гэтай легенды Фольклористика и этнография 264 адрозніваюцца. Так, на Лепельшчыне хлопец мае імя Сцяпан, на Глыбоччыне яго называюць Габрусь [5, с. 27-29]. Але найбольш вялікае адрозненне гэтага сюжэту было зафіксавана ў Докшыцкім раёне Віцебскай вобласці. У галоўнай ролі фігуруе знахар, які сам сабраў змей і іншых «гадаў» у мяшок, але таксама не змог яго данесці: «Адзін знахар знаў, што ж гэта нада ўсіх ужо сабраць, ён сабраў у мяшок і нёс, вот яны сталі тачыцца, сталі яго кусаць, сталі яго грызці, гэтыя ўсе змеі і лягушкі і ўсе, і ён не ўцярпеў… А Бог сказаў: «Раз ты знахар, сабяры, ты умееш іх сабіраць». Ён мяшок паставіў, яны ўсе спаўзаліся, усе к яму ішлі, ішлі. І вот ён нёс-нёс гэты мяшок, не мог ён выцерпіць, і ён упусціў гэты мяшок, і пайшлі яны поўзаць, гэтыя змеі і лягушкі, і ўсе. І Бог так зробіў, што сабірай жа ты сам цяпер, і зробіў знахара буслам, і штоб ён іх сабіраў» (Докшыцкі раён Віцебскай вобласці) [5, с. 30]. Легенда аб паходжанні бусла з‛яўляецца самай знакамітай на тэрыторыі Падзвіння і сустракаецца ў Чашніцкім, Лепельскім, Докшыцкім, Бешанковіцкім, Глыбоцкім, Пастаўскім, Ушацкім і Шаркаўшчынскім раёнах. Другі папулярны сюжэт, які згадваецца як у фальклорна-этнаграфічных зборніках, так і ў ходзе сучасных экспедыцый, звязаны з паходжаннем зязюлі: «Гэта мама расказывала, што зязюля была бабай, і што-та яны там з мужыком пасварыліся, а даўней паветкі былі і зярно там, і семя насыпана, цэлы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

засек быў, і вот яна яго паслала там. Кажыць, там за ільносемям – крупы, схадзі круп дастань. А гэта ж ільносемя, як вада, ты ж на яго стань – яно ж і тонець. Ну вот, яна яго ждала-ждала, а ѐн не прыйшоў. Яна яго звала: «Якуб! Дай круп! Якуб! Дай круп!» І вот яна гэдак зробіла, і яе Бог перавярнуў у зязюлю» [3, с. 96]. На Віцебшчыне часцей за ўсѐ сустракаюцца два розныя напаўненні дадзенага сюжэту. У першым галоўнымі героямі з'яўляюцца жонка з мужам, а ў другім – маці і дачка: «Матка забіла дачку. Дачка тая пацярала ключы, а гэта матка забіла дачку. А тады, калі яна забіла, пачала плакаць: «Аксюш, праснісь, Аксюш, праснісь, ключы нашлісь». І вот яна всѐ кукуець і кукуець, а ключы нашлісь. І Бог яе так аброк – гэтай кукушкай быць» (Віцебскі раѐн Віцебскай вобласці) [5, с. 27]. У народным эпасе з�because яўленне мядзведзя таксама звязана з пакараннем чалавека, які правініўся перад Богам: «Здаўна Бог хадзіў па зямлі, цяпер ужо не ходзіць. Ну, і захацелася мужыку з жонкай спужаць бога. Яны прыбяднелі, бедна жылі. – А што ѐн ходзіць, нас нічым не надзяляець, – спужаем жа і мы яго. І сталі думаць, як яго спужаць. Падлезем пад мост і замычам, а Бог успудзіцца нас. А Бог сказаў: – Калі ж вы так замычалі, то 265 і будзеце век мычаць. І абярнуў іх мядзведзямі. З таго і мядзведзі сталі» [2, с. 54]. Варта звярнуць увагу на тое, што ў іншых сюжэтах у з‟яўленні мядзведзя задзейнічаны людзі, якія маюць розны сацыяльны статус. У беларускім фальклоры існуе значны комплекс легенд, паводле якіх Бог выступае прычынай з'яўлення сакральных элементаў ландшафту. Сярод іх вылучаецца група легенд, якія апавядаюць пра з‟яўленне святых азѐр, крыніц, камянѐў. Некаторыя сюжэты сведчаць аб тым, што раней, калі Бог хадзіў па зямлі, камяні былі мяккія, што дазваляла яму пакідаць на іх свае сляды. Такія камяні маюць назву «камяні-следавікі»: «Адметнай асаблівасцю гэтых камянѐў з'яўляюцца адбіткі слядоў на паверхні ў выглядзе ступні чалавека або лап звяроў і свойскіх жывѐл» [1, с. 31]. Да так званых «Божых камянѐў» ставіліся вельмі пазітыўна, бо, як лічылася, гэтыя камяні малі лекавую сілу: «Даўно Бог ішоў, ступіў, ну во і слядкі. Слядкі там гэтыя чысцілі. Старыя людзі хадзілі і зерне туды, у слядкі, сыпалі, каб добры ураджай быў» (Лепельскі раѐн Віцебскай вобласці) [5, с. 237]. У касмаганічных легендах з‟яўленне водных аб‟ектаў суадносіцца з часам першастварэння і дзейнасцю Дэміўргаў (асабліва з дзейнасцю БогаДэміўрга). Але найбольш распаўсюджанай катэгорыяй аб'ектаў сакральнай геаграфіі Падзвінскага рэгіѐна, безумоўна, з'яўляюцца «святыя» крыніцы: «А вось як сьніш азяро – гэта да апаснасці. А щмыванне у азяры – да радасці. Сьніць балота – гэта значыць нешта нядобра, неблагапрыятнае становішча. А для закаханых – ізмена у каханьні. Але ж і балоты, і азѐры стварыў Бог» (Пастаўскі раѐн Віцебскай вобласці) [5, с. 183-184]. Вельмі высокі семіятычны статус «святых крыніц» выяўляецца ў іх надзвычайных лекавых здольнасцях, што, ва ўяўленнях мясцовага насельніцтва, маюць універсальны характар: «Во, як дзіцѐнак ня спіць, то даюць яму гэную вадзічку. Ці можа там жывоцік круціць яму, ці напужаўся чаго, то ўсѐ вадзічку гэтую даюць і змываюць» [4, с. 46]. Такім чынам, ва ўсім комплексе беларускага народнага эпасу маецца значны аб‟ѐм сюжэтаў, звязаных з вобразам падарожнага Бога. Паводле іх, Бог ходзіць па зямлі і навучае людзей, засцерагае іх ад бедаў, але можыць і караць іх за парушэнне маральна-этычных нормаў. Маральныя прынцыпы, адлюстраваныя ў легендах пра падарожнага Бога, з‟яўляюцца важнымі і актуальнымі для сучаснага беларускага грамадства. Легенды пра паходжанне бусла, зязюлі і мядзведзя з‟яўляюцца найбольш удалымі прыкладамі, калі прычынай для стварэння чагосьці новага з‟яўляецца сімбіѐз жадання чалавека рабіць па-свойму і волі Бога. У той жа час легенды пра паходжанне жывѐл і раслін нельга назваць вынікам наіўнага Фольклористика и этнография 266 светапогляда вясковага жыхара Падзвіння. Легенды падобнага роду сведчаць аб стаўленні беларускага селяніна да касмагоніі і аб выспяванні стыхійна-матэрыялістычных уяўленняў аб прыродзе і грамадстве. Элементы прыроднага ландшафту (крыніца і камень) у традыцыйным светапоглядзе беларусаў Падзвіння не ўспрымаюцца як выключна крыніцы рэсурсаў для гаспадарчай дзейнасці. Яны разглядаюцца ў якасці неад‟емных кампанентаў цэльнай карціны свету, якія ўзыходзяць да часоў «першастварэння». Спіс літаратуры

1 Культавыя і гістарычныя валуны Беларусі / А. К. Карабанаў [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Інстытут прыродакарыстання. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 235 с. 2 Легенды і паданні / [склад. М. Я. Грынблат і А. І. Гурскі; рэд. тома А. С. Фядосік]. – Мінск:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Навука і тэхніка, 1983. – 544 с. 3 Лобач У. А. Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / У.Лобач. –Мінск : Тэхналогія, 2013. – 511 с. 4 Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 1: Народная медыцына беларусаў Падзвіння: у 2 ч. Ч. 1 / склад. А. У.Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – 148 с. 5 Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А.Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння: у 2 ч. Ч. 1. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – 292 с. 6 Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А.Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння: у 2 ч. –Ч. 2. –Наваполацк : ПДУ, 2011. – 368 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ